ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка»
________________________ Мяхедка Н.В.

# ПАЛАЖЭННЕ
## аб раённым аглядзе-конкурсе бібліятэчных клубаў, аматарскіх аб'яднанняў па інтарэсах «Бібліятэка - тэрыторыя чытання, зносін, творчасці»

### *1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ:*

1.1. Дадзенае Палажэнне вызначае парадак арганізацыі і правядзення раённага агляду-конкурсу бібліятэчных клубаў, аматарскіх аб'яднанняў па інтарэсах «Бібліятэка - тэрыторыя чытання, зносін, творчасці» (далей - конкурс).

### *2. МЭТЫ І ЗАДАЧЫ:*

2.1. Мэта конкурсу:
- удасканаленне дзейнасці бібліятэчных клубаў, аматарскіх аб'яднанняў па інтарэсах, якая аб'ядноўвае вакол сябе мясцовую супольнасць праз арганізацыю вольнага часу насельніцтва.

2.2. Задачы конкурсу:
- уцягванне ў арганізаваныя формы забаўляльнай дзейнасці розныя групы насельніцтва;
- прыцягненне ў формы забаўляльнай дзейнасці, непаўналетніх, якія знаходзяцца на розных відах уліку, для занятасці іх вольнага часу;
- абагульненне існуючага вопыту, яго распаўсюджванне і ўкараненне ў практыку работы бібліятэк раёна;
- выяўленне таленавітых людзей, стымуляванне іх творчай актыўнасці;
- развіццё пазнавальнай дзейнасці членаў мясцовай супольнасці на аснове чытацкай дзейнасці;

- садзейнічанне фарміраванню культурнай і чытацкай кампетэнцыі насельніцтва, прасоўванне мастацкай і навукова-папулярнай літаратуры;
- стварэнне самадзейных чытацкіх груп, клубаў па інтарэсах, аматарскіх аб'яднанняў, заахвочванне творчага самаразвіцця ва ўмовах бібліятэкі.

## *3. УМОВЫ КОНКУРСУ:*

3.1. У конкурсе прымаюць удзел бібліятэчныя клубы, аматарскія аб'яднанні па інтарэсах, створаныя на базе бібліятэк ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка».

3.2. Конкурс праводзіцца па наступных намінацыях:
- «Лучший детский клуб»;
- «Лучший клуб для пожилых»;
- «Клуб-долгожитель».

3.3. Конкурс праводзіцца з 1 лютага да 30 лістапада 2026 года. У гэты перыяд па месцы працы клуба, аматарскага аб'яднання:
- праводзяцца мерапрыемствы ў рамках плана работы;
- ажыццяўляецца інфармаванне аб сваёй дзейнасці ў СМІ;
- абагульняецца досвед працы ў альбомах, слайдах, відэа, фатаграфіях.

## *4. ПАТРАБАВАННІ ДА КОНКУРСНАЙ РАБОТЫ:*

4.1. Да конкурснай работы прыкладаюцца:
- заяўка (Дадатак);
- прэзентацыя аб дзейнасці клуба, аматарскага аб'яднання па інтарэсах, выкананая ў праграме Microsoft Power Point або відэаматэрыялы (працягласць не больш за 10 хвілін);

4.2. Прадастаўляецца дакументацыя па аматарскім клубным аб'яднанні:
- спісачны склад удзельнікаў клуба (абавязкова для ўсіх груп);
- склад рады;
- гадавы план і графік работы клуба;
- статут або палажэнне;
- пашпарт клуба;
- пашпарты мерапрыемстваў, кніжных выстаў;

- сцэнары;
- фотаальбомы (фатаграфіі) (варыянт прадстаўлення на меркаванне кіраўніка клуба);
- публікацыі аб дзейнасці дадзенага клубнага аб'яднання ў СМІ (публікацыі аб працы ў перыядычным друку, на афіцыйным сайце ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка»).

## *5. КРЫТЭРЫ АЦЭНКІ.*

- стабільнасць складу ўдзельнікаў;
- рэгулярнасць праведзеных мерапрыемстваў (пасяджэнняў) клубнага аб'яднання;
- паказчыкі колькаснага і якаснага росту аматарскага аб'яднання (калі існуе не першы год, то за апошнія 2 гады);
- асвятленне работы аматарскага аб'яднання ў СМІ;
- узаемасувязі з іншымі калектывамі, адукацыйнымі ўстановамі;
- прыцягненне новых удзельнікаў клубнага аб'яднання;
- выкарыстанне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, дэманстрацыя дзейнасці і творчых работ клубнага аб'яднання ў грамадстве, у т.л. у адукацыйных, культурна-дасугавых арганізацыях, у СМІ, Інтэрнэце.

## *6. УЗНАГАРОДЖАННЕ.*

Пераможцы конкурсу адзначаюцца дыпломамі і граматамі.

Удзельнікі адзначаюцца падзячнымі лістамі.

## *7. АРГКАМІТЭТ.*

Для падвядзення вынікаў конкурсу ствараецца Аргкамітэт і журы, у склад якіх уваходзяць:

Мяхедка Н.В. – дырэктар ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка»;

Глушакова І.М. – загадчык сектара маркетынгу ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка»;

Аршавіран А.М. – метадыст сектара маркетынгу ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка»;

Юрэвіч А.С. – бібліятэкар аддзела камплектавання ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка»;

Гняцько І.А. – бібліятэкар аддзела абслугоўвання і інфармацыі, старшыня першаснай прафсаюзнай арганізацыі ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка»;

Буднік М.К. – бібліятэкар сектара маркетынгу ДУК «Лагойская раённая цэнтральная бібліятэка».

Аргкамітэт аналізуе прадстаўленыя конкурсныя матэрыялы, ацэньвае работы, вызначае найлепшыя і арганізуе ўзнагароджанне пераможцаў. Пераможцы конкурсу адзначаюцца дыпломамі і граматамі. Удзельнікі адзначаюцца падзячнымі лістамі.